вы і інш. Увядзенне ў гэтую работу спецыяльных элементаў, якія фарміруюць і развіваюць маральныя якасці асобы, садзейнічаюць вырашэнню педагагічных мэт, адносіцца да ліку найбольш складаных, бо яны патрабуюць асаблівага таленту, педагагічнага мыслення, бачання асобы, надання ўсёй дзейнасці выхаваўчай скіраванасці. У мэтах больш эфектыўнай выхаваўчай работы неабходны ўлік індывідуальных асаблівасцей кожнага ўдзельніка ў асобасным і псіхалагічным плане. Без прадуманай арганізацыі рэпетыцыі не можа быць ні сапраўднага ўзаемаразумення паміж кіраўніком і калектывам, ні рэалізацыі педагагічнай і мастацкай праграмы.

Канцэртнае выступленне – адказны момант у жыцці калектыву. Яно з'яўляецца паказчыкам усёй арганізацыйнай, выхаваўчай працы кіраўніка і саміх удзельнікаў. Па выступленні мяркуюць аб моцных і слабых баках іх дзейнасці, уменні сабрацца, творчым почырку, арыгінальнасці, тэхнічных і мастацкіх магчымасцях калектыву. Канцэртнае выступленне мае важнае педагагічнае значэнне, таму што гэта не толькі мастацкая з'ява, колькі педагагічны сродак, у аснове якога ляжыць асобае спалучэнне арганізацыйна-метадычных, выканальніцкіх і маральна-эстэтычных фактараў. Канцэртнае хваляванне, што адчуваюць выканаўцы, адбіваецца на эмацыянальна-псіхалагічным і фізіялагічным стане, актывізуе працэс згуртавання калектыву.

Рэзюміруючы сказанае, адзначым, што прафесійныя якасці кіраўніка калектыву мастацкай творчасці ўключаюць як творчыя здольнасці, так і спецыяльныя мастацкія веды, уменні і навыкі, якія праяўляюцца на розных этапах работы па стварэнні твораў сапраўднай эстэтычнай накіраванасці.

*А.Э.Міланіч*

## А.БЕНУА І “НОВЫ РУСКІ БАЛЕТ” ПАЧАТКУ XX ст.

Творчасць А.Бенуа займае асаблівае месца ў рускім мастацтве пачатку XX ст. Як мастак ён быў адным са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стваральнікаў і пастаянных супрацоўнікаў аб’яднання “Свет мастацтва”. Як мастацтвазнаўца, мастацкі крытык і публіцыст А.Бенуа прыцягваў увагу сваёй эрудыцыяй і ўменнем бачыць галоўнае ў бурлівым віры культурнага жыцця на мяжы XIX–XX стст. У музычным тэатры мастак не толькі ствараў дэкарацыі, але часта працаваў як рэжысёр і аўтар лібрэта. Яму ўласцівы вытанчанасць і эстэтызм, тонкае адчуванне стылю і імкненне да цэласнасці музычнага спектакля. Улюблёны ў балет з дзяцінства, А.Бенуа ўсё жыццё аддаваў перавагу гэтаму жанру і па праву лічыцца (разам з С.Дзягілевым і М.Фокіным) ідэолагам і стваральнікам новага балетнага спектакля. “Няхай жыве ... бяздумнае маўчанне, свяшчэнна- дзейства танца,” – усклікае А.Бенуа і сцвярджае, што сярэбраны век адраджае “само паняцце балет” як з’яву вялікай культуры [цыт. па: 4, с. 119].

Вядома, што ў творчай дзейнасці кампазітараў А.Глазунова, П.Чайкоўскага і харэографаў М.Петыпа і Л.Іванова ўзніклі вяршынныя тварэнні рускага класічнага балета. Але ў культурным кантэксце другой паловы XIX ст. перадавая грамадская думка лічыла балет перыферыяй культуры, забаўляльным жанрам, аб’ектам сатыры і жарту. Змяненне адносін да балетнага тэатра адбылося, на думку мастацтвазнаўца В.Абашава, дзякуючы станаўленню “ідэі танца ў якасці адной з дамінант культурнай свядомасці... Менавіта ідэя танца вызначыла напрамак пошуку новых формаў харэаграфіі, стаўшы іх ідэалагічнай падасновай, афарбавала сабою бачанне задач і магчымасцей балета і вызначыла яго ўспрыманне” [1, с. 16]. Ідэя танца пранізвае не толькі эстэтыка-філасофскія разважанні дзеячаў культуры пачатку XX ст., але і займае важнае месца ў творчай праграме мастацкага стылю мадэрн, дамінуючага ў гэты час. Такім чынам, на фундаменце перадавой інтэлектуальнай культуры мяжы XIX–XX стст. складваецца новае разуменне балета, які, у сваю чаргу, падсумоўвае актуальныя ідэі часу і найноўшыя тэндэнцыі развіцця мастацтва. Да стварэння балетнага спектакля эпоха сярэбранага веку далучае лепшыя сілы культуры. Першае месца сярод іх па праву належыць членам творчага аб’яднання “Свет мастацтва” з А.Бенуа і С.Дзягілевым на чале. Таму на мастацкай канцэпцыі гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

садружнасці і будуецца ў асноўным праграма “новага балета”.

У сваіх артыкулах і эсэ А.Бенуа распрацоўвае тэарэтычныя асновы і вылучае галоўныя складаючыя балетнага спектакля [2]. Балет, на яго думку, – гэта перш за ўсё асалода ад прыгажосці, яе чыстае праяўленне. А.Бенуа заклікае выхоўваць у людзях “культ захавання” прыгажосці, а мэту сапраўднага мастака бачыць у раскрыцці гэтай прыгажосці. Сучасны майстар, на думку А.Бенуа, павінен быць інтэрпрэтатарам вечнай прыгажосці, нагадваць людзям пра тыя “мадэлі” творчасці мінулага, што даюць узоры дасканаласці. У праграмным артыкуле “У чаканні гімна Апалону” А.Бенуа пісаў: “... танец можа стаць (павінен стаць) рытмам усяго жыцця, знешнім ператварэннем усёй чалавечай дзейнасці, пастаянным цудам прыгажосці…” [цыт. па: 1, с. 16]. У больш познім сваім артыкуле “Размова пра балет” мастак вылучаў балет як мастацтва, не абцяжаранае словам, як найвышэйшую праяву прыгажосці, як “усмешку бажаства”. “Балет, магчыма, самае красамоўнае з відовішчаў, паколькі ён дазваляе выяўляцца такім двум выдатным праваднікам думкі, як музычны гук і жэсты, ва ўсёй іх паўнаце і глыбіні, не навязваючы ім слоў, якія заўсёды скоўваюць думку і зводзяць яе з нябёсаў на зямлю”, – пісаў ён [цыт. па: 5, с. 214].

Адраджэнне цікавасці да балета ўспрымалася А.Бенуа як сімптом руху да сінтэтычнага мастацтва, гэтай “блакітнай птушкі” сярэбранага веку. У балетным спектаклі павінны раўнапраўна ўзаемадзейнічаць музыка, танец, жывапіс, акцёрскае майстэрства і рэжысура. У сваіх успамінах А.Бенуа піша: “Балет – адно з самых паслядоўных і цэльных выяўленняў ідэі gesamtkunstwerk’а, і менавіта за гэту ідэю наша пакаленне было гатова пакласці душу сваю...” [цыт. Па: 5, с. 540]. З’яўляючыся выразнікам стылістыкі мадэрна, А.Бенуа ў сваёй творчасці імкнуўся да сінтэзу мастацтваў, да гарманічнага і раўнапраўнага спалучэння ўсіх састаўляючых спектакля. Жывапісу, безумоўна, ён надаваў дамінуючае значэнне, а мастак, на яго думку, станавіўся паўнапраўным сааўтарам спектакля. І часам менавіта ён вызначаў яго форму і накіроўваў фантазію кампазітара і харэографа. “Менавіта мы, мастакі, не прафесіяналы-дэкаратары, а сапраўдныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастакі, стварылі дэкарацыі для тэатра. Мы дапамаглі стварыць асноўныя штрыхі танца і ўсю пастаноўку балета цалкам. Менавіта гэта ... прынесла столькі выразнай своеасаблівасці нашым спектаклям”, – адзначаў А.Бенуа [цыт. па: 3, с. 104].

Канцэпцыя аб'яднання “Свет мастацтва” зыходзіць з уяўлення пра тэатр найперш як пра відовішча, “свята для вачэй”, паглыбляючы гэтым самым відовішчную аснову балетнага жанру. Таму задачай, якую ставілі стваральнікі “новага рускага балета”, было стварэнне відовішча, якое здзіўляе раскошай і пышнасцю і ўводзіць гледачоў у ірэальны, рамантычны, умоўнатэатральны свет.

Свае мастацкія і эстэтычныя ідэалы, свой погляд на мастацтва балета А.Бенуа ў поўнай меры выявіў пры стварэнні і пастаноўцы спектакляў “рускіх сезонаў” у Парыжы. Лепшыя яго працы – пастаноўкі балетаў “Павільён Арміды”, “Шапэніяна”, “Пятрушка” – прынеслі сусветную вядомасць рускаму балету.


1. *Абашев В.В.* Танец как универсалия культуры серебряного века // Время Дягилева. Универсалии серебряного века: Материалы Третьих Дягилевских чтений / Перм. ун-т; Сост. В.В.Абашев. – Пермь, 1993. –Вып. 1. – С. 12 –17.

2. *Бенуа А.Н.* Мои воспоминания: В 2 т. – М.: Наука, 1980. – Т. 1–2.

3. *Давыдова М.В.* Очерки истории русского театрально-декорационного искусства XVIII – начала XX века. – М.: Наука, 1974. – 188 с.

4. *Левая Т.И.* Русская музыка начала XX века в художественном контексте эпохи. – М.: Музыка, 1991. – 166 с.

5. *Сергей Дягилев* и русское искусство: В 2 т. / Авт.-сост. И.С.Зильберштейн, В.А.Самков. – М.: Изобразительное искусство, 1982. – Т. 1.


*К.У.Міхайлава*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ